Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

14 СНЕЖНЯ 2024 г. СУБОТА № 244 (30378)

СТАНОЎЧЫ ПРАГНОЗ РАЗВІЦЦЯ 8

«ТОЙ, ХТО ЎЛАСНЫМІ РУКАМІ БУДУЕ, НІКОЛІ НЕ БУДЗЕ РАЗБУРАЦЬ. І НЕ ДАЗВОЛІЦЬ ГЭТА РАБІЦЬ ІНШЫМ»

Фота БелТА.

Чым карысныя студатрады, Прэзідэнт расказаў моладзі на ўласным прыкладзе

У лістападзе, наведваючы абноўлены стадыён «Трактар», Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустракаўся з байцамі студэнцкіх атрадаў. Тады маладыя людзі запрасілі кіраўніка дзяржавы разам з імі закрыць працоўны семестр. Аляксандр Лукашэнка запрашэнне прыняў і ўчора разам з тысячамі актыўных маладых людзей з усёй краіны ўзяў удзел у закрыцці трэцяга працоўнага семестра, якое прайшло ў сталічным Палацы спорту ў фармаце Усебеларускага злёту студэнцкіх атрадаў.

СТАР. 2–4

Адпачынак

НА НОВЫ ГОД — У САНАТОРЫЙ

Адпачыць на навагоднія святы ў санаторыі ў сярэднім каштуе 139 рублёў за суткі, сам святочны банкет абыдзецца прыкладна ў 250 рублёў. Аднак амаль усе месцы на гэты час ужо заняты. Акрамя таго, ужо больш за 70 % месцаў забраніравана ў санаторыях на студзень, больш за 50 % — на люты. Чым выкліканы такі попыт і якім санаторыям аддаюць перавагу адпачывальнікі, расказаў дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні Генадзь БАЛБАТОЎСКІ.

З банкетам і без яго

Паводле яго слоў, запаўняльнасць на Новы год будзе максімальнай. У перыяд галоўных зімовых свят у здраўніцах будзе знаходзіцца больш за 24 тысячы чалавек. З іх амаль палова — госці з Расіі.

— Асноўная мэта — непарыўны лячэбны працэс, але з мерапрыемствамі. Канешне, кульмінацыяй стане навагодняя ноч, і большасць адпачывальнікаў будзе ўдзельнічаць у навагодніх банкетах, а таксама ў навагодніх праграмах на працягу некалькіх дзён, — адзначыў Генадзь Балбатоўскі.

СТАР. 10

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Ідзе падпіска на I квартал і I паўгоддзе 2025 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2025 года, у падарунак календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.

«ТОЙ, ХТО ЎЛАСНЫМІ РУКАМІ БУДУЕ, І НЕ ДАЗВОЛІЦЬ

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

Найперш кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з інтэрактыўнай выстаўкай, на якой прадстаўлены кірункі дзейнасці студатрадаўскага руху ўчора і сёння. Сярод экспанатаў — фотаздымкі найбуйнейшых будоўляў, на якіх працавалі беларускія студэнты. Арганізатары нават знайшлі абсалютны эксклюзіў — фотаздымак Аляксандра Лукашэнкі разам з паплечнікамі па студатрадзе падчас работы на меліярацыйным канале ў Быхаўскім раёне.

Вось гэта карысна!

Увазе кіраўніка дзяржавы прадставілі асноўныя кірункі дзейнасці студэнцкіх атрадаў. Педагагічныя атрады прадэманстравалі тэматычныя настольныя гульні: «Мая Радзіма», «Храналаф гістарычнай памяці: вызваленне Беларусі». Маладыя людзі актыўна выкарыстоўваюць і тэхналогіі віртуальнай рэальнасці, напрыклад, стварылі гістарычную рэканструкцыю подзвігу абаронцаў Полацка «Гераічны дот». Гэтыя напрацоўкі маладыя педагогі выкарыстоўваюць падчас сваёй работы ў аздараўленчых летніках, мерапрыемствах грамадзянска-патрыятычнай накіраванасці. Прэзідэнту паказалі і новыя методыкі, якія маладыя людзі распрацавалі для работы з дзецьмі, што маюць асаблівасці.

На стэндзе прамысловых студэнцкіх атрадаў удзельнікі студатрада «Молат» імя Героя Савецкага Саюза П. М. Гаўрылава правялі майстар-клас па практычнай зборцы рухавіка аўтамабіля ВАЗ-2106. Кіраўніку дзяржавы прадэманстравалі ўжо сабраны ўзор. «Вось гэта карысна!» — ацаніў Аляксандр Лукашэнка. Ён расказаў, што калісьці сам працаваў з такімі рухавікамі. А сёння байцы студатрадаў рупяцца на многіх прадпрыемствах, асаблівую зацікаўленасць праяўляе «Атлант». «Можа, яны і выцягнуць «Атлант», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка, пахваліўшы маладых людзей за працу на вытворчасці.

> **Памятайце, што вашы ідэі і невычэрпная энергія — гэта матор, які рухае Беларусь наперад. Я веру ў вас, у вашу сілу, у вашы таленты, — пажадаў кіраўнік дзяржавы. — Я абсалютна перакананы і дакладна ведаю: наперадзе нас чакае яшчэ больш грандыёзных адкрыццяў і здзяйсненняў. Бо час такі. І ён выбраў нас!**

Брэнд студатрадаўскага руху — будаўнічыя атрады. Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся ў маладых людзей, як яны працуюць на будоўлі: самастойна ці пад кіраўніцтвам спецыяліста. Паколькі маладыя людзі толькі вучацца, на аб'екце ёсць спецыяліст, які ім дапамагае. А на выхадзе яны атрымліваюць рабочую спецыяльнасць. «Аб чым я кажу: трэба аднаго спецыяліста — і ўсё хлопцы зробяць», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Ён зрабіў акцэнт на тым, што такія людзі вельмі патрэбныя краіне.

Маладыя людзі з жаданнем працаваць неабходныя і ў сельскай гаспадарцы. Адзін з кірункаў студатрадаўскага руху — сельскагаспадарчыя атрады. «Ніводнае цяля не загубілі?» — спытаў у маладых людзей Прэзідэнт. Многія байцы сельскагаспадарчых атрадаў працуюць памочнікамі камбайнераў. Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, ці змогуць яны самастойна працаваць за штурвалам. Студэнт БДАТУ Дзмітрый Ліскавец, баец студатрада «Юнацтва 2», заявіў, што ўжо зможа. Хлопец працаваў на камбайне «Дон», і тэхніку гэту асвоіў. Але, як заўважыў Прэзідэнт, яму патрэбна даць паспрабаваць больш сучасны камбайн.

Медыцынскія студатрады паказалі трэнажор сардэчна-лёгачнай рэанімацыі дарослага, на якім адпрацоўваецца навык рэанімацыі. Пра сваю дзейнасць расказалі і студэнты сэрвісных атрадаў. Сярод іх — будучыя журналісты. З ініцыятывай стварыць медыятатрад напярэдадні 80-годдзя перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне выступілі самі студэнты. Маладыя людзі ўжо рэалізавалі некалькі праектаў на Гродзенскім тэлебачанні. Прэзідэнту прадставілі яшчэ адну знаходку — фотаапарат «Зеніт» вытворчасці 1980-х гадоў. Аляксандр Лукашэнка часта расказваў, што ў юнацтве захапляўся фатаграфіяй і здымаў на такі фотаапарат. Маладыя людзі знайшлі падобную мадэль у рабочым стане. І, зразумела, як не зрабіць на яго фота з Прэзідэнтам?! Знаходку кіраўнік дзяржавы ацаніў і ад фота не адмовіўся. Сумеснае фота паўтарылі і на больш звыклы маладым людзям гаджэт — на смартфон, зрабілі сэлфі. «Труд!» — даў старт Прэзідэнт. «Крут!» — працягнулі дэвіз байцы студатрадаў. «Такія прасунутыя ўсе!» — падзяліўся ўражаннямі ад убачанага беларускі лідар.

Адна з найбольш яркіх старонак у жыцці — студатрадаўскі рух

Прэзідэнт выступіў на ўрачыстай цырымоніі закрыцця трэцяга працоўнага семестра. «Вы ўсе маладыя людзі, як і належыць маладосці, накіраваныя ў будучыню. І вы кожны дзень, кожную гадзіну пішаце гісторыю свайго жыцця. Вы стараецеся напісаць гісторыю свайго жыцця яркімі старонкамі. Мая вам парада — менавіта яркімі старонкамі старайцеся пісаць гісторыю свайго жыцця. І адной з найбольш яркіх старонак у вашым жыцці будзе ваш удзел у студатрадаўскім руху. Паверце, я ведаю, аб чым кажу, таму што сам калісьці выйшаў з гэтых радоў і сам калісьці прымаў актыўны ўдзел у гэтым руху», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён звярнуў увагу, што ў жыцці можа быць усялякае. І пажадаў, каб дрэннае забывалася, а добрае заставалася ў памяці. «І чым вышэй вы будзеце на службовай лесвіцы ў сваім жыцці, тым больш будзеце звяртацца да старонак жыцця, якія намалявалі ў момант свайго юнацтва яркімі фарбамі. Яшчэ раз падкрэсліваю: гэта ваша працоўная старонка будзе заўсёды яркай», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён прызнаўся, што, прыйшоўшы да байцоў студатрадаў, дастаў з картатэкі свайго жыцця ўласныя ўспаміны. Па словах кіраўніка дзяржавы, матывацыя ў студэнтаў розных пакаленняў не знікла і не надта змянілася. Маладыя людзі ва ўсе часы хочуць зарабіць грошай, стаць незалежнымі, у тым ліку і фінансава. Гэта нікуды не знікла. «Але вы зусім іншыя, чым былі мы», — заўважыў Прэзідэнт. Ён расказаў, што дзякуючы працы ў студатрадах яму ёсць што сказаць людзям, бываючы ў вяскоўцаў ці ў рабочых. «Я хачу, каб і вам праз многія дзесяцігоддзі было што сказаць. І не толькі вашым дзецям, але і тым суразмоўцам, з якімі вы будзеце сустракацца. А я веру, што з гэтага актыву — вас сёння 4 тысячы чалавек — з'явяцца новыя кіраўнікі, новыя міністры і гэтак далей. Я ўпэўнены, што сярод вас большасць будзе займаць кіруючыя пасады і вам давядзецца капацца ў сваім жыцці, каб сказаць іншым, якімі вы былі. А хочацца быць добрымі», — параіў маладым людзям беларускі лідар.

> **І я перакананы: будуць і іншыя ўсебеларускія маладзёжныя будоўлі, дзе вы папрацуеце, як заўсёды, стаханаўскімі тэмпамі. А праз 5, 10, 20 гадоў з гонарам пакажаце дзецям створанае вамі. І традыцыя, упэўнены, працягнецца. Бо праца студэнцкіх атрадаў — гэта не толькі пра масты, дарогі, будынкі. Гэта заўсёды пра людзей і іх адносіны.**

> **Па словах кіраўніка дзяржавы, матывацыя ў студэнтаў розных пакаленняў не знікла і не надта змянілася. Маладыя людзі ва ўсе часы хочуць зарабіць грошай, стаць незалежнымі, у тым ліку і фінансава. Гэта нікуды не знікла.**

Нагоду для гэтай сустрэчы — ушанаванне найлепшай працоўнай моладзі — Прэзідэнт назваў асаблівай, вельмі прыемнай. Па яго словах, энергія, патрыятызм і энтузіязм гэтай моладзі на працягу многіх месяцаў былі прыкладам для ўсёй краіны. «Менавіта такімі, як вы, з бліскучымі вачыма і вялізным жаданнем зрабіць сваю краіну лепшай, былі юнакі і дзяўчаты, якія запісаліся ў першы савецкі студэнцкі будатрад, каб ехаць на цаліну ў далёкім 1959 годзе. Менавіта такім быў і я, калі за адно лета ў будатрадзе навучыўся цагляную кладку выкладваць. А за другое — спасціг прамудрасці працы меліярацыйнай брыгады», — згадаў кіраўнік дзяржавы. Ён звярнуў увагу, што тыя навыкі на яго цяперашняй пасадзе аказаліся вельмі актуальнымі. «Меліярацыя для Беларусі — гэта назаўсёды», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што каналы трэба пастаянна мадэрнізаваць, даглядаць, што і робіцца. Сёлета, па словах Прэзідэнта, плануецца мадэрнізаваць і вярнуць у севазварот больш за 100 тысяч гектараў зямлі.

НІКОЛІ НЕ БУДЗЕ РАЗБУРАЦЬ. ГЭТА РАБІЦЬ ІНШЫМ»

«Для нас гэта быў не толькі спосаб зарабіць свае першыя грошы, што таксама было вельмі важна. Мы станавіліся іншымі людзьмі. Дарослымі, самастойнымі. Нам было чым ганарыцца. Гэта вельмі актуальна цяпер. Тады мы і так былі дарослымі і самастойнымі — час быў няпросты. Сёння прасцей. І, пабываўшы ў студэнцкім атрадзе, вы, мусіць, і не заўважылі, як сталі абсалютна іншымі людзьмі. Але вашы бацькі, знаёмыя і блізкія гэта заўважылі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Праца ў студатрадах — гэта заўсёды пра людзей і іх адносіны

Прэзідэнт звярнуў увагу, што многія кіраўнікі прадпрыемстваў і нават міністэрстваў упершыню праявілі лідарскія якасці менавіта ў студэнцкіх атрадах. І да гэтага часу захоўваюць свае форменныя курткі як святую працоўную рэліквію. «За 65 гадоў праз студатрадаўскі рух прайшлі некалькі пакаленняў. Не дзясяткі, сотні, тысячы, мільёны, а пакаленні прайшлі. Прыемна, што Беларусь і Расія — адзіныя на постсавецкай прасторы захавалі гэтую выдатную маладзёжную ініцыятыву і ўдыхнулі ў яе новае жыццё, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. — Крыху больш за 20 гадоў таму, у 2003-м, былі арганізаваны першыя маладзёжныя будоўлі суверэннай Беларусі: капітальны рамонт мемарыяльных комплексаў «Хатынь» і «Курган Славы». Выдатныя вытокі. Выдатны пачатак».

Аляксандр Лукашэнка згадаў, што ўдарная праца студэнтаў дапамагала пры рэканструкцыі Аўгустоўскага канала, узвядзенні Беларускай АЭС, дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і іншых знакавых аб'ектаў. «Хачу шчыра прызнацца: ініцыятарамі ўдзелу ў будаўніцтве гэтых аб'ектаў былі вы», — падкрэсліў ён. Прэзідэнт успомніў і нядаўнюю сустрэчу з байцамі студатрадаў на абноўленым стадыёне «Трактар», дзе таксама працавалі маладыя людзі: «Я бачыў той асаблівы гонар і радасць у вачах байцоў, якія там працавалі. І перакананы, што тыя, хто прайшоў такую школу жыцця, — сапраўдныя патрыёты сваёй краіны. Яны іншыя — яны сапраўдныя патрыёты. Бо той, хто ўласнымі рукамі будуе, ніколі не будзе разбураць. І не дазволіць гэта рабіць іншым».

> **Менавіта такімі, як вы, з бліскучымі вачыма і вялізным жаданнем зрабіць сваю краіну лепшай, былі юнакі і дзяўчаты, якія запісаліся ў першы савецкі студэнцкі будатрад, каб ехаць на цаліну ў далёкім 1959 годзе. Менавіта такім быў і я, калі за адно лета ў будатрадзе навучыўся цагляную кладку выкладваць. А за другое — спасціг прамудрасці працы меліярацыйнай брыгады», — згадаў кіраўнік дзяржавы.**

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў красавіку на Усебеларускім народным сходзе студэнты папрасілі падтрымаць іх ініцыятыву і прысвоіць аб'ектам будаўніцтва Цэнтра патрыятычнага выхавання моладзі ў Брэсцкай крэпасці статус Усебеларускай маладзёжнай будоўлі. «Знакавы праект не толькі аб'яднаў усю краіну. Будоўля набыла статус інтэрнацыянальнай. Больш за 200 замежнікаў таксама ўнеслі свой уклад. І я перакананы: будуць і іншыя ўсебеларускія маладзёжныя будоўлі, дзе вы папрацуеце, як заўсёды, стаханаўскімі тэмпамі. А праз 5, 10, 20 гадоў з гонарам пакажаце дзецям створанае вамі. І традыцыя, упэўнены, працягнецца. Бо праца студэнцкіх атрадаў — гэта не толькі пра масты, дарогі, будынкі. Гэта заўсёды пра людзей і іх адносіны. Таму кіраўнікі, якія прадстаўляюць месцы для вас, — дальнабачныя і мудрыя людзі. Усім сэрцам дбаюць пра моладзь і будучыню не толькі сваіх прадпрыемстваў, але і ўсёй краіны. Такіх трэба падтрымліваць», — адзначыў Прэзідэнт. Па яго словах, ён ведае аб тым, што пасля завяршэння працоўнай змены многія маладыя людзі дома шукаюць, дзе б прыкласці свае ўменні. «Кажуць: калі раніцай не наносіш вады, не насячэш дроў ці не накорміш рагулю, то дзень прайшоў дарма. Так і павінна быць у вашых думках. Не губляйце працоўнага запалу. Памятайце, што вашы ідэі і невычэрпная энергія — гэта матор, які рухае Беларусь наперад. Я веру ў вас, у вашу сілу, у вашы таленты, — пажадаў кіраўнік дзяржавы. — Я абсалютна перакананы і дакладна ведаю: наперадзе нас чакае яшчэ больш грандыёзных адкрыццяў і здзяйсненняў. Бо час такі. І ён выбраў нас!»

Гэта прызнанне і вялікі гонар

Для стымулявання дзейнасці студатрадаў, якія працуюць на аб'ектах са статусам Усебеларускай або абласной (Мінскай гарадской) маладзёжнай будоўлі, штогод праводзіцца конкурс на найлепшы студатрад. Па выніках конкурсу ўручаецца пераходны сцяг. У гэтым семестры найлепшым атрадам прызнаны будаўнічы атрад «Дойліды» імя П. І. Блахіна з Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ефрасінні Полацкай. Гэтым студэнтам пашанцавала ўдвая — сцяг ім перадаў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка перадаў пераходзячы сцяг камандзіру атрада Антону Машару і камісару атрада Дар'і Цыбулька. Маладыя людзі падзякавалі кіраўніку дзяржавы за падтрымку студатрадаўскага руху ў Беларусі. І ад імя беларускай моладзі ўручылі памятны падарунак — кельму, на якой выгравіраны аб'екты са статусам Усебеларускай маладзёжнай будоўлі. «У Палацы Незалежнасці знойдзем месца. Калі будзеце там на экскурсіі — паглядзіце», — сказаў Прэзідэнт.

> **Я бачыў той асаблівы гонар і радасць у вачах байцоў, якія там працавалі. І перакананы, што тыя, хто прайшоў такую школу жыцця, — сапраўдныя патрыёты сваёй краіны. Яны іншыя — яны сапраўдныя патрыёты. Бо той, хто ўласнымі рукамі будуе, ніколі не будзе разбураць. І не дазволіць гэта рабіць іншым».**

Павіншаваўшы байцоў найлепшага атрада, беларускі лідар звярнуў увагу, што астатнім атрадам можа быць крыўдна, гэта ён ведае на сваім досведзе. Па яго словах, варта заахвоціць усе студэнцкія атрады. Атрад «Дойліды» сфарміраваны на базе Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ефрасінні Полацкай, у яго ўваходзяць 10 чалавек. Яны працавалі на будаўніцтве Рэспубліканскага цэнтра патрыятычнага выхавання моладзі на базе Кобрынскага ўмацавання Брэсцкай крэпасці. Гэтаму аб'екту быў нададзены статус Усебеларускай маладзёжнай будоўлі.

«ТОЙ, ХТО ЎЛАСНЫМІ РУКАМІ БУДУЕ, НІКОЛІ НЕ БУДЗЕ РАЗБУРАЦЬ. І НЕ ДАЗВОЛІЦЬ ГЭТА РАБІЦЬ ІНШЫМ»

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1-3)

Пасля камісар атрада «Дойліды» Дар'я Цыбулька расказала журналістам, што працуе ў студэнцкім атрадзе ўжо два гады і нарэшце са сваім атрадам дасягнула агульнай мэты. «Сцяг мае вельмі вялікую значнасць. Для нас гэта першы сцяг. Гэта азначае, што мы выканалі вялікую працу, шмат сіл уклалі і нам аддзячылі. Гэта вялікае прызнанне. І для нас гэта вялікі гонар», — падзялілася дзяўчына сваімі ўражаннямі. Яна падкрэсліла, што асабліва важна і ганарова атрымаць сцяг за вынікі працы ў Брэсцкай крэпасці, знакавым месцы для кожнага беларуса. Дар'я расказала, што праца на будоўлі была няпростай: «Нягледзячы на тое, што я дзяўчына, я працавала з хлопцамі на роўных. Мы ўкладвалі тратуарную плітку, разам заліваліі бетон. Мы былі адным цэлым, адно аднаму дапамагалі, бо праект быў няпросты, маштабны. І я ганаруся сабой, што я працую ў студэнцкім атрадзе і ўношу свой уклад у будучыню краіны». Камісар атрада падкрэсліла, што кожны будатрадавец працуе дзеля ідэі, але як прыемны бонус і заработная плата.

Рабочыя рукі нам заўсёды патрэбны

Студэнты звярнуліся да Прэзідэнта з просьбай надаць статус Усебеларускай маладзёжнай будоўлі 2025 года двум аб'ектам — Нацыянальнаму гістарычнаму музею і Парку народнага адзінства. «А справіцеся?» — удакладніў Аляксандр Лукашэнка. Маладыя людзі запэўнілі, што абавязкова. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што на будаўніцтва гэтых аб'ектаў, роўна як і на многія іншыя, патрэбны немалыя фінансавыя затраты. Асноўная нагрузка кладзецца на бюджэт, але паўдзельнічаць варта і грамадству. «Гэта будзе ваш салідны ўклад. І пакаленні будуць памятаць аб вашай будоўлі», — падкрэсліў беларускі лідар. У цэлым чарговую ініцыятыву студатрадаў кіраўнік дзяржавы падтрымаў: «Не пярэчу. Рабочыя рукі нам заўсёды патрэбны».

Прэзідэнту прапанавалі далучыцца да яшчэ адной традыцыі студэнцкіх атрадаў — да спеўкі і разам выканаць «Песню аб трывожнай маладосці». Аляксандр Лукашэнка ў адказ заўважыў, што спявць разам з народным артыстам Уладзімірам Громавым вельмі няпроста, таму што яго голас, вядома, будзе гучаць найбольш яскрава. Аднак, у той жа час, не будзе чутна, калі нехта сфальшывіць. Ад удзелу ў спеўцы кіраўнік дзяржавы, вядома, не адмовіўся. «Я заўважыў, што ўсе міністры спявалі. Вось што такое маладосць!» — падзяліўся пасля сваімі ўражаннямі кіраўнік дзяржавы. Ён пажадаў усім быць заўсёды маладымі.

❍ У тэму

МЫ ЗАСТАЁМСЯ ВЕРНЫМІ НАШАЙ СТУДАТРАДАЎСКАЙ ДРУЖБЕ

У Беларусі гісторыя студатрадаўскага руху пачалася з пачатку 1960-х гадоў. Канкрэтным годам заснавання лічыцца 1963-ы, калі атрад колькасцю 2,5 тысячы студэнтаў з 16 інстытутаў краіны прыняў удзел у будаўніцтве розных аб'ектаў у Заходне-Казахстанскім краі. Росквіт студатрадаўскага руху ў Беларусі прыйшоўся на 1980-я гады. Тады да яго далучыліся каля 35 тысяч маладых людзей. Удзельнікі савецкіх студэнцкіх атрадаў зрабілі добрыя кар'еры і працягваюць працаваць ужо на карысць суверэннай Беларусі.

Старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Міхаіл Мятлікаў пачынаў свой працоўны шлях менавіта ў студатрадзе, быў і байцом, і камандзірам, і начальнікам штаба. На закрыццё працоўнага семестра прыехаў у байцоўцы. «Студатрады — гэта маё жыццё. Сёння спецыяльна надзеў байцоўку, таму што, адзяваючы яе, зноў адчуваю сябе студэнтам. Мне і маім таварышам студатрад даў магчымасць загартаваць характар, даведацца нешта новае, убачыць вялікую краіну, прынесці карысць. Сарака рублёў стыпендыі было недастаткова, таму важна было сваёй працай зарабіць яшчэ грошай», — падзяліўся ён. Міхаіл Мятлікаў успомніў, што разам з таварышамі яны будавалі Мінскую атамную станцыю, якая потым ператварылася ў ЦЭЦ, выязджалі ў Якуцію, будавалі ўзлётна-пасадачную паласу. «І праз шмат гадоў да гэтага часу сябруем з тымі, з кім працавалі. Мы застаёмся вернымі нашаму студатрадаўскаму сяброўству», — падкрэсліў Міхаіл Мятлікаў.

У КРАІНЕ СТВОРАНЫ ЎНІКАЛЬНЫЯ ЎМОВЫ ДЛЯ СТУДАТРАДАЎСКАГА РУХУ

Новы імпульс студатрадаўскі рух атрымаў дзякуючы Указу Прэзідэнта ад 12 мая 2005 года, якім рэгламентавана дзейнасць студатрадаў, вызначаны прэферэнцыі для іх удзельнікаў. Сёння ў Беларусі дзейнічае амаль чатыры тысячы студэнцкіх атрадаў, у якіх працуюць больш за 57 тысяч маладых людзей. Як заўважыў першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Аляксандр Лук'янаў, у Беларусі, як ні ў якай іншай краіне постсавецкай прасторы, створаны ўнікальныя ўмовы для студатрадаўскага руху. «На Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі ўскладзена найважнейшая функцыя па арганізацыі гэтай работы. Выбудавана структура: ад лінейнага ўзроўню першасных арганізацый да гарадскога, раённага і абласнога ўзроўняў. Рэспубліканскі штаб працоўных спраў штогод праводзіць работу па падпісанні пагадненняў больш як з

дзвюма тысячамі наймальнікаў — гэта тыя арганізацыі, якія даюць маладым людзям магчымасць папрацаваць. Сярэдняя заработная плата студатрадаўцаў складае ад 800 да 3,5 тысячы беларускіх рублёў на розных аб'ектах, — падкрэсліў ён. — Мы вельмі рады бачыць маладых людзей, якія знайшлі сябе ў студэнцкіх атрадах, не толькі паспрабаваўшы працоўную спецыяльнасць, але і атрымаўшы яе. Сёння мы праводзім работу, накіраваную на тое, каб маладыя людзі ў рамках працаўладкавання атрымлівалі не толькі тэарэтычную і практычную базу, але і сертыфікат-пасведчанне аб атрыманні рабочай спецыяльнасці».

«САМАЕ ГАЛОЎНАЕ — ГЭТА ЖАДАННЕ ПРАЦАВАЦЬ»

Брэндам студатрадаўскага руху з'яўляюцца ўсебеларускія маладзёжныя будоўлі. Пачынаючы з 2004 года, калі першай будоўляй быў Аўгустоўскі канал, сёння гэта ўжо Хатынь, Астравецкая АЭС, цэнтр патрыятычнага выхавання ў Брэсце. Камандзір тэрытарыяльнага штаба студэнцкіх атрадаў Маскоўскай раённай арганізацыі БРСМ Ягор Нікіцін тры гады запар працаваў на будаўніцтве Беларускай атамнай станцыі. А цяпер падбірае будучых байцоў для студатрадаў. «Самае галоўнае для байцоў студатрадаў — гэта жаданне працаваць, адказнасць і ўменне падтрымаць сябра. І, вядома, імкненне ўнесці свой уклад у агульную вялікую справу», — адзначыў ён.

«Маладыя людзі актыўна прымаюць удзел у студатрадаўскім руху і становяцца важным элементам на шляху фарміравання будучыні нашай эканомікі. Мы рэальна ствараем будучыню разам», — канстатаваў Аляксандр Лук'янаў. І студатрады дапамагаюць набыць ім неабходныя кампетэнцыі, каб у будучыні працаваць больш эфектыўна. Гэта на сваім прыкладзе адчуў Кірыл Клінтухоў, камандзір найлепшага сэрвіснага студэнцкага атрада «Аэрафлот» — студэнт Акадэміі авіяцыі. Улетку малады чалавек разам з таварышамі

працаваў на Мінскам заводзе грамадзянскай авіяцыі. Паводле яго слоў, галоўнае, што ён вынес, — гэта практычныя навыкі, неабходныя ў будучай прафесіі. «Для мяне гэта вельмі карысна. Працуючы ў студатрадзе, я прымяняю свае веды на практыцы. Гэта магчымасць пазнаёміцца з рознымі людзьмі, маімі будучымі калегамі», — падзяліўся Кірыл.

Валерыя СЦЯЦКО, фота БелТА.

ПАРАДАК ДНЯ «ПЯЦЁРКІ»

Раман Галоўчанка — аб ЕАЭС: «Інтэграцыя рэальна дзейнічае, што дазваляе нам годна спраўляцца са знешнімі выклікамі»

Фота Бел ТА.

Прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка прыняў удзел у пасяджэнні Еўразійскага міжурадавага савета, які прайшоў учора, 13 снежня, у Маскве. На чым акцэнтаваў увагу калег кіраўнік беларускага ўрада — у нашым матэрыяле.

Раман Галоўчанка адзначыў, што, на думку беларускага боку, адным з кірункаў, які павінен быць у цэнтры ўвагі, з'яўляецца прамысловая кааперацыя і забеспячэнне тэхналагічнага суверэнітэту:

— Без вырашэння гэтай задачы не праглядаюцца перспектывы развіцця нашага саюза, — акцэнтаваў увагу прэм'ер-міністр. — Для разумення значнасці прамысловага сектара дастаткова паглядзець на абсалютныя лічбы: у студзені — верасні 2024 года аб'ём прамысловай вытворчасці склаў у ЕАЭС больш за 1,1 трыльён долараў.

На яго думку, адным з інструментаў вырашэння задач індустрыяльнага развіцця беларускі бок бачыць у паскарэнні дзейнасці па праграме субсідзіравання з бюджэту ЕАЭС кааперацыйных праектаў у прыярытэтных галінах прамысловасці.

Таксама ў цэнтры ўвагі — сумеснае вырашэнне пытанняў забеспячэння харчаваннем і цэн на яго. Гаворачы аб развіцці аграпрамысловага комплексу і забеспячэнні харчовай бяспекі, Раман Галоўчанка нагадаў, што гэтыя пытанні прэм'ер-міністры краін ЕАЭС ужо абмяркоўвалі ў чэрвені бягучага года на пасяджэнні ЕМПС, што прайшло ў Нясвіжы.

Ён падкрэсліў, што з таго часу актуальнасць азначанай тэмы толькі ўзрасла:

— Па асобных таварах — масла сметанковае, бульба, капуста, морква, цыбуля, яблыкі — у нашых краінах адзначаецца значнае ваганне цэн, ёсць прыкметы невялікага дэфіцыту.

З пункту гледжання прэм'ера, паасобку справіцца з рызыкамі, якія існуюць, і забяспечыць насельніцтва краін «пяцёркі» ключавымі харчовымі таварамі ў неабходным аб'ёме па прымальных цэнах значна складаней, чым вырашаць гэтую надзённую задачу разам.

Што датычыцца стварэння ўмоў для эфектыўнага функцыянавання лагістычнага комплексу і транспартнай сістэмы, Раман Галоўчанка канстатаваў: важны фактар эканамічнага росту ў ЕАЭС і прасоўванні еўразійскай прадукцыі на знешнія рынкі — стабільнае функцыянаванне транспартна-лагістычнай сістэмы, адаптаванае да пераарыентацыі таварных патокаў на дружалюбныя юрысдыкцыі краін Усходу, Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна, глабальнага Поўдня.

Між іншым ён адзначыў, што ёсць пэўныя заўвагі да дзейнасці інтэграцыйнага аб'яднання:

— Інтэграцыя рэальна дзейнічае, што дазваляе нам годна спраўляцца са знешнімі выклікамі, забяспечваць дадатковую ўстойлівасць эканомік, развіваць новыя кампетэнцыі ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, высокіх тэхналогіях і г. д. Аднак пры ўсіх дасягненнях і поспехах варта прызнаць, што таго прарыву, які меўся на ўвазе пры падпісанні дагавора аб ЕАЭС у 2014 годзе, пакуль не адбылося, — канстатаваў Раман Галоўчанка.

> **БЕЛАРУСЬ БУДЗЕ СТАРШЫНСТВАВАЦЬ У ЕАЭС У 2025 ГОДЗЕ**
>
> **Прэм'ер-міністр Беларусі Раман Галоўчанка запэўніў удзельнікаў «пяцёркі», што беларускі бок з поўнай адказнасцю паставіцца да гэтай місіі і зробіць усё магчымае для далейшага паступальнага развіцця Еўразійскага эканамічнага саюза.**

Аб чым гаворка? Прэм'ер патлумачыў: у ЕАЭС не вырашаны ўсе пытанні, якія першапачаткова ставіліся. Так, напрыклад, не пераадолена палярнасць поглядаў на гарманізацыю заканадаўства ў сферы фінансавых рынкаў. Таксама складана ідзе працэс лічбавізацыі. Неабходны больш канкрэтны і прыземлены дыялог па кліматычным парадку дня.

На думку прэм'ер-міністра, неабходны сур'ёзны аналіз вынікаў рэалізацыі стратэгічных напрамкаў развіцця еўразійскай эканамічнай інтэграцыі да 2025 года.

Кажуць удзельнікі:

Міхаіл МІШУСЦІН, старшыня Урада Расійскай Федэрацыі:

— За першыя тры кварталы рост валавога ўнутранага прадукту Еўразійскага эканамічнага саюза склаў звыш 4,5 %. Прыкладна на столькі ж павялічылася прамысловая вытворчасць. А абарот рознічнага гандлю вырас практычна на 8 %, перавозкі пасажыраў — амаль на 7,5 %. Каардынуючы намаганні, мы здольныя дамагчыся яшчэ большых вынікаў. Перш за ўсё па такіх прыярытэтных кірунках, як тэхналагічны суверэнітэт Саюза.

Акылбек ЖАПАРАЎ, старшыня Кабінета міністраў — кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Кыргызстана:

— Хачу адзначыць станоўчую дынаміку эканамічных паказчыкаў дзяржаў — членаў ЕАЭС, падкрэсліўшы, што Кыргызстан таксама захоўвае добрыя тэмпы эканамічнага развіцця, што абумоўлена правядзеннем эканамічных рэформаў, пашырэннем унутранай вытворчасці, ростам экспарту і інвестыцый. Аб'ём узаемнага гандлю Кыргызскай Рэспублікі з дзяржавамі — членамі ЕАЭС у студзені—кастрычніку 2024 года павялічыўся на 13,7 %, пры гэтым экспартныя пастаўкі выраслі на 25,4 %, а імпарт — на 9 %. За 11 месяцаў 2024 года аб'ём даходаў дзяржаўнага бюджэту павялічыўся на 19 % у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года.

Нікол ПАШЫНЯН, прэм'ер-міністр Арменіі:

— Яшчэ адной ключавой тэмай з'яўляецца развіццё транспартна-лагістычнага патэнцыялу ЕАЭС, дзе магчымасці дзяржаў-членаў задзейнічаны не ў поўным аб'ёме. У гэтым кантэксце лічу неабходным яшчэ раз адзначыць важнасць маштабнага для нашага рэгіёна інфраструктурнага праекта «Скрыжаванне свету», які прадугледжвае стварэнне і мадэрнізацыю цэлага шэрагу транспартна-камунікацыйных шляхоў. Дадзены праект, ініцыіраваны Рэспублікай Арменія, у канчатковым выніку забяспечыць спрыяльныя ўмовы для развіцця гандлёва-эканамічных сувязяў паміж усімі зацікаўленымі дзяржавамі на аснове поўнай павагі суверэнітэтаў і юрысдыкцый краін, а таксама прынцыпу раўнапраўя і ўзаемнасці.

Вольга АЛЯКСАНДРАВА.

> *Будзем прымаць і пэўныя папераджальныя дзеянні, каб нашы верагодныя сапернікі і праціўнікі разумелі, што з намі лепш не звязвацца, што з намі трэба жыць дружна. Мы на гэта нацэльваем усю палітыку нашай дзяржавы.*
>
> *Аляксандр Лукашэнка на пасяджэнні Савета Бяспекі. 12 снежня 2024*

На ўсе выклікі і пагрозы звяртаецца пільная ўвага і прымаюцца пэўныя меры

Кіраўнік дзяржавы пастаянна нацэльвае не толькі ваенных, але і людзей з іншых сфер на тое, што самазаспакойвацца і расслабляцца ні ў якім разе нельга: час гэтага не дазваляе. Людзі ў пагонах, на чыіх плячах ляжыць адказнасць за спакойнае жыццё беларусаў, прымаюць усе меры, каб краіна працягвала мірна жыць і працаваць. Сведчаннем таму стала чарговае пасяджэнне Савета Бяспекі, дзе былі зацверджаны планы абароны краіны на найближэйшую пяцігодку. Часы мяняюцца, мэты застаюцца нязменнымі. На гэта звярнуў увагу і Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ:

«Нягледзячы на тое, што ўнутры Беларусі сітуацыя спакойная і пад кантролем, па-за ўвагай не застаецца сітуацыя на знешнім перыметры Рэспублікі Беларусь. Сёння тая ваенна-палітычная абстаноўка, якая складваецца вакол Беларусі, на жаль, працягвае нагнятацца і тыя дзеянні, якія робяцца перш за ўсё ЗША і кіраўніцтвам блока НАТА ў дачыненні да нашай краіны, не могуць не выклікаць заклапочанасці. Мы бачым іх агрэсіўныя дзеянні, накіраваныя, перш за ўсё, на дэстабілізацыю ўнутры нашай краіны. Але тыя эканамічныя, палітычныя меры, якія яны прымаюць, не даюць выніку, што прадугледжваўся нашымі апанентамі. Таму стаўка робіцца на ваенны складнік».

Дзяржсакратар Савета Бяспекі прывёў факты, якія гэта пацвярджаюць: на тэрыторыі ўсходне-еўрапейскага рэгіёна на пастаяннай аснове знаходзяцца групоўкі колькасцю звыш 32 тысяч чалавек, там размешчана 17 батальённа-тактычных груп, прычым 11 — непасрэдна каля граніц Польшчы і краін Балтыі з Беларуссю. Колькасць авіяцыйнай групоўкі вагаецца ў межах 2200—2230 баявых самалётаў. З іх каля 1120—1130 самалётаў на пастаяннай аснове знаходзяцца на аэрадромах Польшчы і краін Балтыі. Цяпер на тэрыторыі Еўропы праходзіць тры буйныя вучэнні, адно з якіх у Літве, у непасрэднай блізкасці ад беларускай граніцы. Акрамя таго, пастаянна фіксуюцца пралёты разведвальнай авіяцыі.

«Акрамя гэтага, абстаноўка вельмі напружаная на паўднёвых рубяжах нашай краіны. Спецыяльная ваенная аперацыя і дзеянні, якія робяцца кіраўніцтвам Украіны ў адносінах да нашай краіны, таксама не носяць міралюбівы характар. Нас абвінавачваюць у тым, што мы стварылі нейкія групоўкі, узмацненні на паўднёвых граніцах. Яшчэ пяць гадоў мы ўвогуле не ахоўвалі паўднёвыя граніцы (маецца на ўвазе прыцягненне ваеннага кантынгенту ў дадатак да пагранічнікаў. — **«Зв.»**), таму што Украіну разглядалі як суседа, які не ўяўляе пагрозы для нашай краіны. І нас спрабуюць абвінаваціць у тым, што мы на паўднёвых граніцах стварылі нейкія групоўкі, якія пагражаюць бяспецы Украіны», — сказаў Аляксандр Вальфовіч, падкрэсліўшы, што беларускія групоўкі на паўднёвым напрамку па колькасці значна ўступаюць украінскім. Дзяржаўны сакратар канстатаваў, што на ўсе выклікі і пагрозы звяртаецца пільная ўвага і прымаюцца адпаведныя меры.

Валерыя СЦЯЦКО.

«Бязвіз» — яшчэ на год

Бязвізавы ўезд у Беларусь для грамадзян еўрапейскіх краін прадоўжаны да канца 2025 года. Пра гэта паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце.

«Улічваючы папулярнасць беларускага «бязвізу» сярод замежнікаў, кіраўніком дзяржавы прынята рашэнне аб прадаўжэнні бязвізавага ўезду для грамадзян 38 еўрапейскіх дзяржаў. Замежнікі па-ранейшаму змогуць прыязджаць у Беларусь без візы да 31 снежня 2025 года ўключна», — падкрэслілі ў ведамстве.

З пачатку дзеяння бязвізавага рэжыму ў 2022 годзе Беларусь наведалі больш за 1 мільён грамадзян краін Еўропы. Найбольшай папулярнасцю бязвізавы ўезд карыстаецца ў турыстаў з сумежных краін — Літвы, Латвіі, Польшчы, а таксама Германіі, Эстоніі, Італіі, Францыі і Вялікабрытаніі.

Падрабязная інфармацыя аб парадку бязвізавага ўезду ў Беларусь размешчана на інфармацыйным партале Дзяржпагранкамітэта.

«Грубае парушэнне прынцыпаў і нормаў міжнароднага права»

Савет Рэспублікі і Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу прынялі заяву аб неабходнасці спынення блакады ЗША супраць Кубы.

У заяве Нацыянальнага сходу вітаецца прыняцце на 79-й сесіі Генасамблеі ААН рэзалюцыі аб неабходнасці спынення эканамічнай, гандлёвай і фінансавай блакады, уведзенай ЗША супраць Кубы.

«Парламент Рэспублікі Беларусь паслядоўна выступае за адмену блакады Кубы і рашуча асуджае незаконную санкцыйную палітыку ў дачыненні да дружалюбнага кубінскага народа, якую мы расцэньваем як грубае парушэнне прынцыпаў і нормаў міжнароднага права, сфармуляваных у Статуце ААН», — гаворыцца ў заяве. Таксама ў заяве падкрэсліваецца, што блакада негатыўна ўплывае на развіццё краіны і парушае правы чалавека. Наступствы эканамічнай блакады Кубы таксама перашкаджаюць гандлёвым адносінам з трэцімі краінамі, парушаючы законныя права дзяржаў супрацоўнічаць з Гаванай у поўным аб'ёме.

Беларускія парламентарыі выказваюць салідарнасць з кубінскім народам і пацвярджаюць нацэленасць на садзейнічанне далейшаму ўмацаванню палітычных, эканамічных і культурных сувязяў паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Куба. Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь заклікае да поўнага і безумоўнага спынення блакады супраць Кубы і прыняцця міжнароднай супольнасцю дзейсных крокаў, якія забараняюць прымяненне аднабаковых прымусовых мер як неправамерных з пункту гледжання міжнароднага права.

МЕХАНІЗМ АДЗІНСТВА ЗАПУШЧАНЫ

13—14 снежня маштабную грамадска-культурную акцыю прымаюць Баранавічы

Як заўсёды, праграма «Марафону адзінства» змястоўная, насычаная падзеямі і эмоцыямі. Тут адбываецца шмат цікавых сустрэч, знаёмстваў, адкрыццяў. Удзельнікі марафону маюць магчымасць пазнаёміцца з горадам, яго адметнасцямі, славутасцямі і, вядома, жыхарамі.

Сімвалічны старт акцыі даў **старшыня Баранавіцкага гарвыканкама Максім АНТАНЮК:**

— Наш горад вельмі рады прымаць «Марафон адзінства». Мы аддаём належнае арганізатарам за тое, як яны ўмеюць падкрэсліць асаблівасці кожнага горада. Баранавічы — горад прамыслоўцаў, чыгуначнікаў, авіятараў. І гэта найлепшым чынам адлюстравана ў праграме мерапрыемства. А яшчэ мы сёння становімся горадам, які танцуе. Менавіта ў нас упершыню ў рамках марафону майстар-клас дае Вялікі тэатр Беларусі».

Таксама ён адзначыў, што марафон сапраўды аб'ядноўвае ўсіх грамадзян нашай краіны.

Ужо традыцыйны праект «Разам працуем, разам спяваем!», які ў нефармальнай абстаноўцы знаёміць блогераў, журналістаў, гасцей з прадпрыемствамі горада — гаспадара акцыі, зрабіў прыпынак на знакамітым Баранавіцкім вытворчым баваўняным аб'яднанні. Добрай раніцы і паспяховай работы напачатку ўсім пажадала **старшыня канцэрна «Беллегпрам» Таццяна ЛУГІНА.** А потым на імправізаваную сцэну выйшлі артысты. Несумненна, гэтая музычная паўза падарыла добры настрой работнікам.

Вядомы і пазнавальны праект «Адну справу робім» прывёў удзельнікаў мерапрыемства на Баранавіцкі аўтаагрэгатны завод. Завадчане гэтым разам сустракалі калег-партнёраў з ААТ «Кавальскі завод цяжкіх штамповак» з Жодзіна і ААТ «Валмет» з Ваўкавыска.

Разыначкай сустрэчы стаў запуск «Механізма адзінства». Яго вырабілі з металу спецыяльна да марафону ў выглядзе сімвалічнага контуру краіны з адмысловым завадным механізмам. Таксама ўсе тры прадпрыемствы абмяняліся падковамі на шчасце. А артысты — фіналіст праекта «Зорны шлях» Андрэй Цямчык і фіналістка конкурсу «Песня года» Аляксандра Мелех — дадалі ўсім святочнага настрою.

Упершыню на «Марафоне адзінства» прайшоў майстар-клас артыстаў аркестра Вялікага тэатра Беларусі. А для юных танцораў харэографы правялі майстар-клас па балеце. Мерапрыемства ў Палацы дзіцячай творчасці сабрала шмат гледачоў.

Уражаннямі ад майстар-класа падзяліўся **дырэктар Дзіцячай харэаграфічнай школы мастацтваў горада Баранавічы Генадзь ЧАРНЯЎСКІ:** «Для нас наведванне такіх велічынь балетнага мастацтва стала не проста падзеяй, а сапраўдным святам. Паўтары гадзіны працягваўся майстар-клас, які правялі прыма-балерына Вялікага Ірына Яромкіна і балерына Анастасія Голешава. Дзеці не толькі ўбачылі вядучых майстроў беларускага балета, але і пагаварылі з імі, задалі пытанні. Для нашых выхаванцаў гэта ўражанні на ўсё жыццё. Яны атрымалі імпульс на будучыню. Яны не хацелі сыходзіць з залы, трэба было бачыць іх шчаслівыя вочы!

А для педагогаў найлепшай ацэнкай стала выказванне Ірыны Яромкінай, што ў гэтай зале сярод 130 выхаванцаў яна ўбачыла нямала талентаў, якія трэба развіваць і заахвочваць. Артысты такога ўзроўню былі ў нас упершыню, і мы шчыра ўдзячныя «Марафону адзінства» за гэта».

Шмат чаго цікавага, шмат чаго ўпершыню адбылося ў гэты дзень у Баранавічах: і выстаўкі, такія, напрыклад, як экспазіцыя Нацыянальнай акадэміі навук «Погляд за гарызонт», і новыя спікеры традыцыйных сустрэч, шчырыя размовы, накшталт той, якую правяла са студэнтамі **кіраўнік прадстаўніцтва Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы ў Мінску Марыяна ШЧОТКІНА** «Маё жыццё. Мой шлях. Мой Прэзідэнт».

Падрабязна пра «Марафон адзінства» ў Баранавічах чытайце ў наступным нумары газеты.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота БелТА.

«Мы не можам страціць нашу краіну, у нас іншай няма»

Аб чым гаварылі на XI Форуме маладых журналістаў

Мерапрыемства, арганізаванае ў сталіцы Міністэрствам інфармацыі, для айчыннай медыясупольнасці традыцыйнае. Чаго не скажаш пра тэму, якая гучала як «Роля новых медыя ва ўмовах электаральнай кампаніі». І гэта цалкам абгрунтавана: наша краіна ўступіла ў найважнейшы перыяд грамадска-палітычнага жыцця, а хто, як не журналісты, з'яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі асвятлення электаральнай кампаніі, фарміруюць грамадскую думку?! У гэты важны момант у тым ліку супрацоўнікі сродкаў масавай інфармацыі праходзяць іспыт на адказнасць і прафесіяналізм. Маладыя журналісты не выключэнне.

«Інфармацыйная вайна — гэта не дзесьці там, гэта тут, у нас»

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір ПЯРЦОЎ адзначыў, што форум — гэта магчымасць шчыра пагаварыць аб тым, якія выклікі і пагрозы цяпер стаяць перад краінай. «Інфармацыйная вайна — гэта не дзесьці там, гэта тут, у нас, — падкрэсліў ён. — І калі мы не будзем адэкватна, згуртавана рэагаваць на выклікі і пагрозы ад тых, хто не жадае нашай краіне дабра, страцім самае галоўнае, што ў нас ёсць, — нашу Радзіму. У гэтай вайне павінны ўдзельнічаць не толькі цэнтральныя сродкі масавай інфармацыі. Кожны ў рэгіянальным медыя павінен разумець, што ў гэты востры момант публікацыі аб культурным жыцці, аб пчолках, матыльках не будуць з'яўляцца тым дзейсным шчытом, эфектыўным супрацьдзеяннем стужцы навін, якія фарміруюць, як потым мы даведаліся, цэнтры інфармацыйна-псіхалагічных аперацый».

Нашых журналістаў, як падкрэсліў Уладзімір Пярцоў, вучаць казаць праўду, прычым не толькі станоўчага характару. «Толькі кажучы праўду, здымаючы праўду, апісваючы праўду, выязджаючы першымі, можна перахапіць парадак дня ў нашых апанентаў, якія глытаюць пыл цяпер, не паспяваючы за нашымі дзяржаўнымі нацыянальнымі або калядзяржаўнымі патрыятычнымі СМІ», — канкрэтызаваў ён.

Па словах намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, важна паспяваць за апошнімі тэндэнцыямі ў медыяіндустрыі. Пры гэтым нельга забываць аб правілах бяспекі ў інтэрнэце. «Кожная сацыяльная сетка збірае пра вас каля 150 метаданых: дзе вы знаходзіцеся, якая ў вас прылада, што вы гугліце, аб чым вы гаворыце, хто вашы сябры, які ў вас пол, узрост, — засяродзіў увагу ён. — Сацыяльная сетка ведае пра вас усё. Яна гандлюе вашымі данымі, прадаючы іх камусьці».

У гэты складаны момант, калі ідзе інфармацыйнае супрацьборства, як заўважыў Уладзімір Пярцоў, журналісты з'яўляюцца асноўнымі баявымі штыкамі. «Як бы гэта ні гучала, але мы цяпер ваюем, — удакладніў ён. — І ад таго, наколькі эфектыўна будзем заяваць мы, залежыць тое, ці разгорнецца ў нас поле бітвы з сапраўднай лятальнай зброяй. Мы не можам страціць нашу краіну, у нас іншай няма».

У рэспубліканскіх СМІ — звыш 7,5 мільёна падпісчыкаў

Міністр інфармацыі Марат МАРКАЎ звярнуў увагу на тое, што час паскараецца, назіраецца нон-стоп развіцця новых медыя, якія кардынальна мяняюць ландшафт інфармацыі і камунікацыі. «Лічбавае асяроддзе стала ідэальнай глебай для росту мноства форм і інструментаў падачы інфармацыі, — падкрэсліў ён. — Штучны інтэлект замяняе дзясяткі спецыяльнасцяў, а ўчарашні блогер-аматар сёння па ахопе і аўтарытэце нярэдка канкурыруе з цэлымі рэдакцыямі. Ён ужо лідар меркаванняў, ён — у тэме, у рэсурсе, і яго кантэнт карыстаецца часта шматмільённым попытам».

Пры гэтым, як канстатаваў кіраўнік інфармацыйнага ведамства, у пагоні за рэйтынгамі і хайпам часта ігнаруюцца нормы праўды і маралі, ствараецца альтэрнатыўная рэальнасць. «І што можам гэтаму супрацьпаставіць мы з вамі, традыцыйныя СМІ?» — пацікавіўся ён і прапанаваў як вопытным журналістам, так і тым, хто толькі пачынае свой шлях у прафесіі, падумаць, як менавіта яны могуць забяспечыць інфармацыйную незалежнасць краіны і стаць моцнай чацвёртай уладай.

Па словах Марата Маркава, маладому журналісту сёння дадзена тое, чаго не было яшчэ паўтара-два дзясяткі гадоў таму, — найшырэйшы выбар поля дзейнасці. «Толькі ў рэспубліканскіх беларускіх СМІ — больш за 7,5 мільёна падпісчыкаў, — канкрэтызаваў ён. — Імкліва развіваецца TikTok, у якога ў Беларусі прырост падпісчыкаў толькі па раённых рэдакцыях СМІ за 12 месяцаў — 50 % (да 2 мільёнаў ужо)». Пры гэтым, як заўважыў міністр, шэраг сацыяльных сетак, якія маюць дзясяткі і сотні мільёнаў падпісчыкаў, мала задзейнічаны.

Марат Маркаў заклікаў маладых журналістаў не імкнуцца акунацца выключна, як гэта цяпер пераважае, у культурную ці спартыўную сферы, а выбіраць палітыку. «Гэта складаны шлях, на ім вы сустрэнеце не так шмат канкурэнтаў, і пры гэтым вам будзе вельмі цікава, — перакананы ён. — Але гэта выклік, а для журналіста выклік — гэта заўсёды магчымасць. Менавіта ў такіх умовах ваша прафесія праяўляе сваё асаблівае значэнне — служэнне грамадству, адданасць сваёй краіне. Прыйшоўшы ў журналістыку, вы ўжо выбралі шлях, які патрабуе не толькі таленту, але і прафесійнага абавязку перад краінай і людзьмі, а яшчэ смеласці і самаахвярнасці».

Празрыстасць выбараў і нацыянальныя інтарэсы

Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар КАРПЕНКА расказаў аб актуальных пытаннях, звязаных з падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Кіраўнік Цэнтрвыбаркама падрабязна спыніўся на ключавых зменнях выбарчага заканадаўства. У прыватнасці, патлумачыў сутнасць новага паняцця, разумець якое ў тым ліку павінны і журналісты, — электаральны суверэнітэт.

«Электаральны суверэнітэт, па сутнасці, з'яўляецца краевугольным каменем з пункту гледжання забеспячэння не толькі празрыстасці выбараў і правядзення іх у нашых нацыянальных інтарэсах, але і стварэння пэўных умоў для таго, каб мы не дапусцілі якога-небудзь умышальніцтва ў наш выбарчы працэс, — патлумачыў ён. — Часткова, калі працавалі над зменнем нашага заканадаўства, мы ўжо заклалі шэраг норм, якія, на наш погляд, дазволяць забяспечыць электаральны суверэнітэт і абараніць усіх удзельнікаў выбарчага працэсу».

Ігар Карпенка канстатаваў, што ўсё часцей даводзіцца назіраць, як электаральныя кампаніі выкарыстоўваюцца для падрыву асноў стабільнасці ў дзяржаве, становяцца аб'ектам умышальніцтва звонку, падвяргаюцца гібрыднаму ўздзеянню.

Дырэктар Нацыянальнага філіяла (прадстаўніцтва) МТРК «МІР» у Беларусі Вольга ШПІЛЕЎСКАЯ распавяла аб інструментах уплыву новых медыя на грамадскую думку. На канкрэтных прыкладах удзельнікі форуму змаглі пераканацца аб уздзеянні новых медыя на ход выбарчай кампаніі, ролі сацыяльных сетак у арганізацыі пратэстаў. Асобна яна спынілася на дзезінфармацыі, якая таксама становіцца інструментам дасягнення палітычных і эканамічных мэт.

Вольга Шпілеўская звярнула ўвагу, што вельмі важна ўсведамляць патэнцыял новых медыя і выкарыстоўваць іх з розумам, каб ствараць карысны і якасны кантэнт, які садзейнічае развіццю грамадства і культуры. «Медыясупольнасць павінна вызначыцца, у які бок працаваць: рэагаваць на запыты аўдыторыі і не спрабаваць іх памяняць, што, безумоўна, прасцей, або пачаць паступова фарміраваць густы грамадства», — падкрэсліла яна.

Вераніка КАНЮТА.
Фота БелТА і Віктара ІВАНЧЫКАВА.

ЗАМАЦАВАЦЬ СТАНОЎЧЫ ТРЭНД

Рост ВУП і заробкаў: тэмпы росту беларускай эканомікі вышэйшыя за сусветныя паказчыкі

Звычайна на пачатку года розныя міжнародныя арганізацыі агучваюць свае прагнозы наконт развіцця эканомік тых ці іншых краін. І іх ацэнкі традыцыйна палітызаваныя. Вось і ў дачыненні да Беларусі з 2022 года тыя ж заакіянскія так бы мовіць эксперты рабілі апакаліптычныя прагнозы. Маўляў, беларуская эканоміка будзе ў заняпадзе, і жыхарам амаль не будзе на што жыць. Але, як гаворыцца, супраць фактаў нічога не зробіш. І днямі той жа міжнародны валютны фонд прызнаў: Беларусь аказалася на трэцім месцы ў рэйтынгу краін Еўропы па прагназаваным росце ВУП у 2024 годзе. Згодна з іх ацэнкамі, рост ВУП складзе 3,6 працэнта. Гэта, дарэчы, амаль супадае з прагнозам беларускага ўрада. Нагадаем, згодна з устаноўленымі планамі развіцця беларускай эканомікі, гэты паказчык павінен скласці 3,8 працэнта. І гэта вышэй за сусветныя тэмпы. У чым сакрэт поспеху беларускай мадэлі, разбіраўся наш карэспандэнт.

ВЫЙСЦІ НА ТРАЕКТОРЫЮ РОСТУ

Нагадаем, у кастрычніку мінулага года Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў найважнейшыя прагнозныя параметры развіцця краіны на 2024 год. Галоўная мэта — забеспячэнне ўстойлівасці эканомікі і рост дабрабыту насельніцтва. Прырост валавога ўнутранага прадукту прагназуецца на 3,8 працэнта за кошт маштабных інвестыцыйна-вытворчых праграм, рэалізацыі беларускай прадукцыі на знешніх рынках і пашырэння ўнутранага попыту. А вось інфляцыя не павінна перавысіць узровень 6 працэнтаў. Чакаецца і рост рэальнай зарплаты. Станоўчыя эканамічныя прагнозы зацверджаны і на наступны год. Рост ВУП Беларусі ў 2025 годзе запланаваны вышэй за тэмпы развіцця сусветнай эканомікі. Пазітыўныя вынікі чакаюцца за кошт нарошчвання аб'ёмаў экспарту, інвестыцыйнага развіцця і кантролю за інфляцыяй. Яна не павінна перавысіць 5 працэнтаў. Што датычыцца гэтага года, то вынікі 10 месяцаў паказваюць: ёсць усе перадумовы не толькі выйсці на зададзены арыенцір, але і перасягнуць яго.

— ВУП Беларусі ў студзені — кастрычніку 2024 года вырас на 4,2 працэнта — гэта па-ранейшаму вышэй за прагнозныя і сярэднесусветныя значэнні, — паведамілі ў Міністэрстве эканомікі. — Прамысловасць працягвае працаваць з высокімі тэмпамі: за 10 месяцаў — 106,2 працэнта. Значна павялічаны выпуск легкавых аўтамабіляў, грузавікоў, аўтобусаў, вагонаў, матацыклаў, акумулятараў. Прадукцыя беларускіх вытворцаў запатрабавана: існуючы ўзровень запасаў ніжэйшы за яго сярэдняе значэнне за апошнія 10 гадоў.

Рознічны тавараабарот за студзень — кастрычнік таксама захаваў высокія тэмпы — 111,8 працэнта, што звязана з апераджальным ростам рэальных даходаў насельніцтва, а таксама стрыманым ростам індэкса спажывецкіх цэн. Пры гэтым штомесяц прырастаюць інвестыцыі ў асноўны капітал.

— Прадпрыемствы працягваюць актыўную мадэрнізацыю: паскоранымі тэмпамі растуць затраты на набыццё машын, абсталявання, транспартных сродкаў, — дадалі ў эканамічным ведамстве.

Беларуская прадукцыя запатрабавана на знешніх рынках. Пра гэта яскрава сведчыць статыстыка знешнегандлёвага абароту краіны. У студзені — кастрычніку 2024 года ён павялічыўся ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 6,1 працэнта — да 82,8 млрд долараў.

— Мы ўзмацняем сваю прысутнасць на рынках дружалюбных дзяржаў, нарасцілі пастаўкі ў Афрыку — у 3,7 раза. Экспарт паслуг вырас на 10 працэнтаў, — расказалі ў Міністэрстве эканомікі.

І яшчэ адна важная лічба. Устойлівая работа эканомікі дазволіла забяспечыць у студзені — верасні 2024 года сярэдні ўзровень зарплаты — больш за 2,2 тысячы рублёў, а рэальны рост пенсій па ўзросце склаў 109,7 працэнта.

ЗАКАНАМЕРНЫ РОСТ

Эксперты звяртаюць увагу: дасягнутыя вынікі прадказальныя. Эфектыўная мадэль кіравання з арыенцірам на грамадзян дае свой плён. Нават нягледзячы на няспынную санкцыйную палітыку Захаду ў адносінах да Беларусі, эканоміка не проста выйшла з зоны аднаўленчага росту, а актыўна ўвайшла ў фазу развіцця, звярнуў увагу **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Дзяніс КАРАСЬ.**

— Адзін з асноўных драйвераў развіцця эканомікі — прамысловасць, якая паказвае найвялікшыя тэмпы росту сярод краін Еўразійскага эканамічнага саюза. Станоўчыя тэндэнцыі дэманструе і знешні гандаль. Павелічэнне спажывання хатніх гаспадарак падтрымана ростам рэальных грашовых даходаў насельніцтва і пашырэннем спажывецкага крэдытавання. Беларускую сацыяльна-эканамічную мадэль развіцця сёння многія ставяць у прыклад. Нягледзячы на невялікую тэрыторыю, мы вялізная краіна ў інавацыйным плане. Беларусь цэняць замежныя партнёры за прадказальнасць і празрыстасць. Плюс мы валодаем унікальным кадравым патэнцыялам. Пасля распаду СССР мы не пайшлі шляхам павальнай прыватызацыі, а захавалі калектывы і актыўна развівалі галіны, якія сёння выступаюць драйверамі росту. І, безумоўна, нашу прадукцыю любяць за нязменна высокую якасць. Усё гэта дае магчымасць нам дынамічна развівацца і нарошчваць дабрабыт нашых грамадзян.

Ва ўмовах няпростай геапалітычнай сітуацыі мы актыўна займаемся дыверсіфікацыяй экспарту. Нарошчваюцца пастаўкі ў Азію, Афрыку і Кітай. Комплексная мадэрнізацыя прадпрыемстваў дазваляе выходзіць на рынак з канкурэнтаздольнай і запатрабаванай прадукцыяй. Своечасова пачалася рэалізацыя імпартазамяшчальных праектаў з Расійскай Федэрацыяй. Вынікі сумеснай работы ўжо ёсць. Усе гэтыя праекты накіраваны на ўмацаванне тэхналагічнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь і Саюзнай дзяржавы. Важна, што да нас у краіну прыходзяць інвестары, якія жадаюць рэалізаваць буйныя праекты. Беларусь — краіна прадказальная. І тут працаваць можна і трэба.

ПРАГНОЗ СА ЗНАКАМ ПЛЮС

Паводле прагнозаў Еўразійскага банка развіцця, тэмпы росту эканомікі Беларусі ў 2025 годзе застануцца на павышаным узроўні. Пра гэта паведаміла **кіраўнік Цэнтра краінавага аналізу Дырэкцыі па аналітычнай рабоце ЕАБР Марына САБАЛЕЎСКАЯ.** Спецыялісты банка лічаць, што рост эканомікі Беларусі ў 2024 годзе складзе 4,3 працэнта і паб'е папярэднюю лічбу.

Беларуская прадукцыя запатрабавана на знешніх рынках. Пра гэта яскрава сведчыць статыстыка знешнегандлёвага абароту краіны. У студзені — кастрычніку 2024 года ён павялічыўся ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 6,1 працэнта да 82,8 млрд долараў.

— Мы прагназуем захаванне павышаных тэмпаў росту ў наступным годзе. Паводле нашай ацэнкі, у 2025-м ВУП Беларусі вырасце. Сярод асноўных драйвераў будзе павелічэнне экспарту ў Расію, рост даходаў насельніцтва і пашырэнне інвестыцый, — сказала Марына Сабалеўская.

Што датычыцца інфляцыі, паводле ацэнак ЕАБР, у 2024 годзе яна складзецца паблізу мэтавага арыенціра 6 працэнтаў. На наступны год банк прагназуе ўмеранае павышэнне інфляцыі да 6,6 працэнта.

— Мы чакаем, што Нацыянальны банк Беларусі захавае стаўку рэфінансавання на бягучым узроўні 9,5 працэнта гадавых, — дадала Марына Сабалеўская.

Валянцін ПАЎЛОВІЧ.

У тэму

У Беларусі зафіксаваны самы высокі рост рэальнай заработнай платы сярод краін Еўразійскага эканамічнага саюза па выніках студзеня — верасня 2024 года. Пра гэта паведамілі ў Еўразійскай эканамічнай камісіі. Эксперты ЕЭК адзначылі, што за 9 месяцаў года ва ўсіх краінах ЕАЭС вырасла зарплата ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Самыя высокія тэмпы росту сярэднямесячнай рэальнай заработнай платы зафіксаваны ў Беларусі (113 працэнтаў) і Расіі (109 працэнтаў). У Кыргызстане рэальная зарплата вырасла на 6,7 працэнта, у Арменіі — на 6,6 працэнта, у Казахстане — на 2,9 працэнта. Найбольшы рост намінальнай зарплаты за гэты перыяд зафіксаваны таксама ў Беларусі — на 19,6 працэнта. У Расіі яна вырасла на 18 працэнтаў, у Казахстане і Кыргызстане — на 11,8 працэнта, у Арменіі — на 6,6 працэнта.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона)
информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, находящегося в собственности Минской области и принадлежащего Государственному предприятию
«УКС Вилейского района» (Продавец)
на праве хозяйственного ведения

Аукцион состоится 13.01.2025 в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1:
легковой седан CHEVROLET LACETTI,
кузов (рама) KL1NF19BJ8K913152.
Начальная цена с НДС 20 % – 5 616,00 руб.
Место нахождения:
Минская область, г. Вилейка, ул. 1 Мая, 89.
Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **gki.gov.by,** Минского областного исполнительного комитета **minsk-region.gov.by,** на электронной торговой площадке Организатора аукциона gostorg.by.
Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by
УНП 190055182

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего
ОАО «Премьерлизинг» (Продавец)

Электронные торги состоятся 26.12.2024.

Лот № 1: Торговый комплекс
с инв. № 200/D-168451, 1599,8 кв. м.
Адрес:
Витебская область, г. Витебск, ул. Богатырева, 8А-3.
Торговый комплекс с инв. № 200/D-168451 находится в капитальном строении с инв. № 200/С-81193, расположенном на земельном участке 240100000001009153 площадью 0,2152 га.
Право аренды. Доля: 9/10.
Обременения: ипотека, аренда, сервитут.
Подписание договора купли-продажи и его регистрация возможны только при условии получения согласия залогодержателя по договору об ипотеке.
Организатор электронных торгов и Продавец не несут ответственности за незаключение договора купли-продажи с Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) по причине, вызванной обстоятельствами, изложенными выше.
Начальная цена с НДС 20 % – 1 245 589,00 долларов США.
Задаток – 424 309,89 руб.
Шаг электронных торгов – 5 %.
Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **20.12.2024 в 16.00.**
Организатор электронных торгов:
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by
УНП 190055182

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего
ОАО «Белыничский райагропромтехснаб»
(Продавец)

Электронные торги состоятся 26.12.2024 в 10.00.

Лот № 1: Производственный цех
с инв. № 701/С-11253, 683,8 кв. м,
Могилевская обл., Белыничский р-н, Вишовский с/с, 17, вблизи д. Большой Нежков.
Начальная цена с НДС 20 % – 57 300,66 руб.
Задаток – 5 730,07 руб.
Обременение: аренда.
Земельный участок 720480500001000007 (площадь 0,2350 га).
Право постоянного пользования.
Шаг электронных торгов – 5 %.
Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **20.12.2024 в 16.00.**
Организатор электронных торгов:
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by
УНП 190055182

Шыбеніцы, рабаванні, расстрэлы

Што цяпер адбываецца ў Сірыі?

Навіны з Сірыі ўражваюць жорсткасцю — з'яўляецца ўсё больш відэа з расправамі над жыхарамі гэтай шматпакутнай блізкаўсходняй краіны. Вал жахлівых кадраў дае падставы сцвярджаць аб пачатку грамадзянскай вайны, адзначае vz.ru. Групоўкі, якія прыйшлі да ўлады, канфліктуюць адна з адной, і іх супрацьборства будзе ўзмацняцца падчас дзяльбы тэрыторый і рэсурсаў краіны. Без арміі і паліцыі абвастрыліся этнаканфесійныя канфлікты — звядзенні даўніх рахункаў выліваюцца ў сапраўдную разню.

Азвярэлыя натоўпы

Па меры таго як новыя ўлады спрабуюць устанавіць кантроль над гарадамі і правінцыямі Сірыі, з'явілася шмат відэаматэрыялаў з пакараннямі смерцю і катаваннямі жыхароў рэспублікі. Таксама паведамлялася пра нібыта пакаранне смерцю стрыечнага брата экс-прэзідэнта Башара Асада, перадае RT. Як паведаміла мясцовае выданне Alkhali24, «з прыбыццём у Латакію авангарда сірыйскіх паўстанцаў было абвешчана, што Сулейман аль-Асад, які кіраваў сіламі Нацыянальнай абароны, быў забіты». Па звестках выдання, яго павесілі з дапамогай пад'ёмнага крана на плошчы ў Латакіі. Прычынай забойства стала кроўная сувязь з былым прэзідэнтам. Пры гэтым мясцовыя тэлеграм-каналы апублікавалі відэазапіс моманту публічнага пакарання.

Яшчэ на адным з відэа баевікі расстрэльваюць шпіталізаваных салдат урадавай арміі. На другім — цягнуць вяроўкамі напаўжывога чалавека па дарозе. На трэцім — збіваюць вайскоўца ў прысутнасці яго маці. І падобных ролікаў — дзясяткі. Эксперты папярэджваюць, што некаторыя з іх могуць быць наўмысна «ўкінуты» ў сацсетцы. «Як мінімум частка з іх адносіцца да больш ранніх падзей грамадзянскай вайны», — адзначыў vz.ru ўсходазнаўца Кірыл Сямёнаў. Аднак, паводле яго слоў, у большасці выпадкаў расправы ладзяць стыхійна ўзніклыя мясцовыя групоўкі, якія змаглі атрымаць доступ да зброі. На думку Кірыла Сямёнава, сітуацыя «можа перарасці ў разню канфесійных меншасцяў». Напрыклад, «усіх алавітаў называюць «памагатымі рэжыму» і ўсе яны ў небяспецы», а ў Дамаску і Алепа «здаецца, што адносна спакойна, і «ўзброеная апазіцыя» праводзіць рэпрэсіі «спарадкавана», але ніхто не можа быць упэўнены, што па яго не прыйдуць».

Днямі стала вядома аб тым, што ўзброены натоўп спаліў магілу бацькі Башара Асада ў яго родным горадзе Кардаху ў правінцыі Латакія. У гэтым жа месцы, побач з Хафезам Асадам, быў пахаваны яго старэйшы сын Басіль, там жа была пахавана жонка Хафеза Асада — Аніса Махлюф. На гэтым фоне аб небяспецы хаосу ў Сірыі перапужана загаварылі і ў ЕС. Так, кіраўнік еўрадыпламатыі Кая Калас заявіла, што «ў інтарэсах усіх», каб краіна не скацілася да новай грамадзянскай вайны і не спарадзіла чарговы крызіс бежанцаў. Яна заклікала новыя ўлады краіны не ісці па шляху Ірака, Лівіі і Афганістана.

> **Сацыяльна-эканамічная няроўнасць, міжэтнічныя і міжрэлігійныя супярэчнасці, цяжкае гістарычнае мінулае, адвольна праведзеныя граніцы могуць спарадзіць далейшую дэстабілізацыю Блізкага Усходу.**

Усе супраць усіх

Тым часам выпадкаў самасуду і распраў будзе назірацца ўсё больш, бо ў Сірыі многія жадаюць звесці рахункі адзін з адным, заўважыў vz.ru Дзмітрый Брыджэ, эксперт Цэнтра араба-еўразійскіх даследаванняў. «Таму што няма ўрада, няма інстытутаў, няма парадку: краіна засталася без арміі і паліцыі і апынулася ў глыбокім крызісе», — адзначыў эксперт.

Улада дасталася групоўцы «Хаят Тахрыр аш-Шам» (ХТШ), якая ў многіх краінах аднесена да тэрарыстычных арганізацый. «Калі ва ўладзе вайсковыя групоўкі, якія не займаліся палітыкай, а толькі баявымі дзеяннямі, яны не разумеюць, што такое суд. Любую праблему яны прывыклі вырашаць зброяй. Таму мы ўсё часцей будзем бачыць выпадкі самасудаў», — заўважыў Дзмітрый Брыджэ.

Што да перспектыў развіцця канфлікту, то пакуль большасць груповак пабойваюцца ХТШ, але гэтая сітуацыя можа змяніцца. «З турмаў выпушчаны тысячы баевікоў, у тым ліку ігілаўцаў. Цяпер яны значна ўзмоцняцца, — лічыць ваенны эксперт Юрый Лямін. — Супраць іх могуць выступіць курды (яны арыентаваны на ЗША), якія цяпер супрацьстаяць Сірыйскай нацыянальнай арміі (СНА). Пад кантролем курдаў застаюцца раёны паўночнага ўсходу Сірыі і нафтавыя палі. Гэта грошы».

Яшчэ адна магчымая лінія супрацьстаяння — канфлікт ХТШ і СНА, адзначыў эксперт. У папярэднія гады паміж імі ўжо былі сутыкненні. «Акрамя таго, там ёсць групоўкі на поўдні краіны, якія нядаўна паднялі мяцеж. Яны, мусіць, таксама жадаюць удзельнічаць у дзяльбе ўлады», — растлумачыў Юрый Лямін. Асабліва складаная сітуацыя ў Латакіі, дзе пражываюць алавіты. Сюды ўвайшлі буйныя сілы баевікоў, у рэгіёне ідуць пазасудовыя расправы над былымі вайскоўцамі.

Пояс нестабільнасці

Падзеі ў Сірыі — частка тых глабальных змяненняў, якія ўжо адбываюцца ў свеце. Пра гэта ў эфіры «Альфа Радыё» заявіў дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Аляксандр Шпакоўскі. «Выгадаатрымальнікі ў гэтай сітуацыі відавочныя. Гэта калектыўны Захад, Ізраіль, шэраг ісламскіх дзяржаў, напрыклад Турцыя, — лічыць эксперт. — У найбольшай зоне рызыкі знаходзіцца Іран, дзе няпростае знешнепалітычнае становішча, унутрыпалітычная абстаноўка і сацыяльна-эканамічная сітуацыя».

Палітычная нестабільнасць можа спасцігнуць іншыя краіны Блізкага Усходу, адзначыў ТАСС намеснік старшыні Расійска-Іранскага дзелавога савета пры Гандлёва-прамысловай палаце РФ, усходазнаўца Алег Акулінічаў. «На Блізкім Усходзе фарміруецца цэлы пояс нестабільнасці. У Сірыю ўвайшло ізраільскае войска. Працягваецца аперацыя ў сектары Газа, захоўваецца напружанасць на граніцы Ізраіля і Лівана. У рэгіёне ўзрастае роля ваеннай сілы, ён насычаецца ўзбраеннямі, а некаторыя блізкаўсходнія краіны могуць паспрабаваць стварыць зброю масавага знішчэння», — лічыць эксперт. Паводле яго слоў, «сацыяльна-эканамічная няроўнасць, міжэтнічныя і міжрэлігійныя супярэчнасці, цяжкае гістарычнае мінулае, адвольна праведзеныя граніцы могуць спарадзіць далейшую дэстабілізацыю Блізкага Усходу». Як заўважыў аналітык, у нестабільнасці «зацікаўлены ЗША, якія спрабуюць рэалізоўваць так званую стратэгію кіраванага хаосу на Блізкім Усходзе».

Вашынгтон працягвае выконваць ролю «геапалітычнага лялькавода». Пра гэта заявіў намеснік кіраўніка МЗС Расіі Сяргей Рабкоў, паведаміла ТАСС. Дыпламат адзначыў: гісторыя нічому не вучыць Вашынгтон, а яго ўмяшанне ў многіх краінах Блізкага Усходу прыводзіла да трагічных наступстваў. «Пасля прыходу і ўмяшання амерыканцаў заставаліся руіны, і гэтыя руіны ў многіх месцах не адноўлены да гэтага часу. Не працуюць інстытуты, якія яны спрабавалі ўкараніць на месца таго, што зламалі ў сілу сваіх уяўленняў. Няма стабільнасці ў многіх жыхароў і няма дабрабыту, зразумела, — падкрэсліў Сяргей Рабкоў. — Не хацелася б думаць, што нешта падобнае ў выніку іх дзеянняў можа быць падрыхтавана і для Сірыі, але пакуль тое, што адбываецца, выклікае вялікую трывогу».

Як заўважыла індыйскае выданне Hindu, найбольш верагодным варыянтам далейшага развіцця сітуацыі застаецца «паглыбленне хаосу і нестабільнасці. У гэтым трагедыя Сірыі».

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

«СЭРЦАМ РАЗУМЕЎ, ШТО ДЗЯРЖАЎНЫ ГІМН — ГЭТА СВЯТОЕ»

Аўтар слоў дзяржаўнага гімна стаў народным паэтам Беларусі

На гэтым тыдні Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 462 пра дзяржаўныя ўзнагароды і званні. У ім гаворыцца сярод іншага, што высокае званне «Народны паэт Беларусі» прысвоена Уладзіміру КАРЫЗНУ.

Фота Канстанціна ДРОБАВА.

«Самы песенны паэт Беларусі» — так называюць Уладзіміра Карызну. Ён аўтар не толькі шматлікіх паэтычных зборнікаў — яго вершы сталі асновай для соцень песень. А самае галоўнае — менавіта Уладзімір Карызна стаў аўтарам слоў гімна незалежнай Рэспублікі Беларусь. *«Сэрцам разумеў, што дзяржаўны гімн — гэта святое. Гучанне яго надае гонару за сваю краіну, узмацняе ўпэўненасць... Скажу шчыра: мяне агарнулі вялікая напружанасць і адказнасць. Разумеў, што дзяржаўны гімн не проста песня, а самы галоўны музычны твор краіны. За ім стаяць дзяржава, народ. Для напісання такога надзвычай важнага твора патрэбна мець вялікі творчы запас. Вось у такіх развагах і працаваў... Словы для новага варыянта гэтага важнага дзяржаўнага твора, як пацеркі, перабіраліся ў памяці мноства разоў, адшліфоўваліся, выкрышталізоўваліся ў рыфмаваныя радкі, клаліся пад мелодыю. Сам Гасподзь дараваў натхненне выказацца трапна».*

За працу над тэкстам гімна Уладзімір Карызна быў узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны. Мае і шмат іншых узнагарод: ён лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь... А належыць да пакалення дзяцей вайны. Бацька пайшоў у партызаны, пасля і маці з чатырма маленькімі дзецьмі з-за небяспекі перабралася ў партызанскі атрад. Давялося перажыць шмат: фашысцкую блакаду ў балотах, голад і нястачы. «Але бацькі цярпліва пераносілі цяжкасці, а мы гэтаму вучыліся ў іх», — успамінаў Уладзімір Карызна. Паэту не ўдалося атрымаць музычнай адукацыі, хоць здольнасці былі вялікія.

А паэзіі ён вучыўся ў народнай песні.

«Паэзія падобная на музыку. Яна настолькі тонкая, глыбінная, што не пішацца, а іграецца!.. Яна, зразумела, з'яўляецца цяжка: гэта як ураджай сабраць... І ў той жа час — як на скрыпцы сыграць: не кожны зможа, гэта тонкая праца душы», — аднойчы прызнаўся паэт. І сапраўды, няма беларуса, якім б не ведаў на памяць творы Уладзіміра Карызны, магістральная тэма якіх — любоў да Радзімы:

«Неба чыстае і глыбокае,
І бярозавы ціхі гай...
Беларусь мая, сінявокая,
Беларусь мая, родны край...»

Песня на гэтыя ўзнёслыя словы прагучала ў 1960 годзе ў выкананні Дзяржаўнага хору БССР пад кіраўніцтвам Генадзя Цітовіча. Самыя таленавітыя кампазітары ствараліпесні на словы Уладзіміра Карызны — Юрый Семянка, Яўген Глебаў, Дзмітрый Смольскі, Ігар Лучанок, Эдуард Ханок, Леанід Захлеўны, а таксама сын паэта, вядомы кампазітар Уладзімір Карызна-малодшы. Некаторыя з тых песень ужо ўспрымаюцца як народныя... Дарэчы, і сам паэт сачыняў мелодыі песень, якія ўвайшлі ў рэпертуар вядомых музыкаў.

«Беларусь заўсёды мілая і дарагая майму сэрцу», — сцвярджае народны паэт Беларусі Уладзімір Карызна, якому летась споўнілася 85 гадоў. І гэта пачуццё любові да Радзімы гучыць у кожным яго творы.

Людміла ІВАНОВА.

НА НОВЫ ГОД — У САНАТОРЫЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Разам з тым ёсць установы, якія пайшлі па нетрывіяльным шляху, зусім адмовіўшыся ад навагодняга стала. Прадугледзелі праграму і розныя лакацыі з пачастункамі, але без навагодняга банкету. Аргумент такі: у санаторыі вячэра заканчваецца пасля 18.00, а некаторыя заканчваюць харчаванне а восьмай гадзіне, і праз дзве гадзіны ім ізноў садзіцца за стол, а банкет каштуе пэўных грошай. Запаўняльнасць у гэтых установах таксама стапрацэнтная: ніхто не адмовіўся ад удзелу ў навагодняй праграме з-за адсутнасці навагодняга банкету.

Што датычыцца павышанай цаны ў навагодні перыяд, а яна ў сярэднім каля 139 рублёў, то гэта тлумачыцца ажыятажным попытам на пуцёўкі ў перыяд свят. Да таго ж пералік паслуг, якія ўключаюцца ў кошт знаходжання ў санаторыі, пашыраны. Сярэдні ж кошт пуцёвак па выніках IV квартала чакаецца на ўзроўні 115 рублёў. Гаворка зноў-такі ідзе аб адным ложка-дні ў стандартным двухмесным нумары. У цэлым па годзе кошт пуцёўкі складзе каля 110 рублёў.

— Рост, калі браць аналагічныя перыяды, у прынцыпе ў рамках прагнозу макраэканамічнага развіцця і інфляцыйных працэсаў, — адзначае Генадзь Балбатоўскі.

Аздараўліся 1,5 мільёна чалавек

Цэны на наступны год ужо зацверджаны, ідзе рэалізацыя пуцёвак. Цэны нязначна, але павысіліся ў параўнанні з бягучым перыядам. Розніца ў цэнах паміж IV кварталам 2024 года і першым паўгоддзем 2025-га чакаецца ў межах 5 %.

Адметна, што сёлета адзначаецца павелічэнне глыбіні продажаў. На сёння запатрабавана ранняе браніраванне і санаторыі, якія маюць найлепшую матэрыяльна-тэхнічную базу. Нягледзячы на тое, што там цэны самыя высокія, усё роўна яны карыстаюцца найбольшым попытам. Адпаведна працэнт браніравання месцаў сярод санаторыяў вышэйшай катэгорыі самы высокі.

Генадзь Балбатоўскі дадаў: штогод павялічваецца попыт на санаторна-курортнае лячэнне. І сёння гэта прыбытковы бізнес.

— Вядома ж, мы працуем у кірунку пошуку інвестараў і будаўніцтва санаторыяў і аздараўленчых устаноў, прычым прыродны патэнцыял дае магчымасць гэта рабіць, — адзначыў Генадзь Балбатоўскі. — Сёлета ў адпаведнасці з даручэннем прэм'ер-міністра быў распрацаваны пералік такіх аб'ектаў з улікам прыроднага патэнцыялу. Рэспубліканскі цэнтр сумесна з выканаўчай уладай праводзяць інфармацыйную работу па прыцягненні інвестараў для будаўніцтва гэтых аб'ектаў. Неабходная інфармацыя ёсць на сайтах райвыканкамаў, аблвыканкамаў, рэспубліканскага цэнтра. Усе прапановы, якія паступаюць у выканкамы або рэспубліканскі цэнтр, разглядаем і прапануем патэнцыяльна перспектыўныя месцы.

Што датычыцца вынікаў работы сістэмы санаторна-курортнага лячэння і аздараўлення ў 2024 годзе, то паказчыкі мінулага года ўдалося значна перавысіць, у тым ліку па сярэднегадавой запаўняльнасці. Выросла і колькасць тых, хто прайшоў лячэнне і аздараўленне, гэта каля 1,5 мільёна чалавек. Сума выручкі складзе больш за 1,2 мільярда рублёў.

Станоўчая тэндэнцыя адзначаецца і па экспарце. Сёлета ў беларускіх здраўніцах адпачыла больш за 240 тысяч чалавек — лічба нават большая, чым у самым паспяховым 2019 годзе. Выручка ад экспарту павялічыцца больш чым на 20 %. У 1,5 раза выраслаі колькасць сродкаў, накіраваных уласнікамі на развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы. Гэта лічба перасягне 160 мільёнаў рублёў.

Алена КРАВЕЦ.

Спеўны сімвал эпохі

У Нацыянальнай бібліятэцы прэзентавалі новы віртуальны праект «Песняры»: малітва галасоў і сэрцаў»

Прымеркаваны гэты праект да 55-годдзя легендарнага ансамбля. Ён падрыхтаваны галоўнай бібліятэкай краіны сумесна з музеем Уладзіміра Мулявіна Белдзяржфілармоніі, Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва і Нацыянальным гістарычным музеем Рэспублікі Беларусь.

Галоўны бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Юлія Амосава заўважыла, што сёння, калі ў розных папяровых і віртуальных крыніцах багата інфармацыі пра «Песняроў», важна было зрабіць рэсурс, які дапаможа сучаснай моладзі, што не заспела эпоху Уладзіміра Мулявіна, больш зразумець феномен калектыву, даведацца пра музыкантаў, якія ўваходзілі ў яго склад у розныя гады, бо ў гэты вакальна-інструментальны ансамбль заўсёды адбіраліся найлепшыя.

Рэсурс будзе карысны і даследчыкам, бо тут пададзены архіўныя матэрыялы, увесь масіў крыніц, якія сабраны ў бібліятэцы. Ёсць і ўнікальныя дакументы — мала хто ведае, што адзін з заснавальнікаў калектыву Валерый Яшкін меў навуковую ступень кандыдата мастацтвазнаўства. У бібліятэцы захоўваецца яго аўтарэферат дысертацыі па тэме «Тэатралізацыя ў мастацтве савецкай эстрады», брашура, прысвечаная вакальна-інструментальным ансамблям, шэраг артыкулаў. На сайце можна знайсці інфармацыю па гісторыі калектыву, яго сцэнічных строях, артыкулы даследчыкаў творчасці, афішы, плакаты. У галоўнай кніжнай скарбніцы захоўваюцца дыскі і пласцінкі «Песняроў», якія можна паслухаць пры наведванні бібліятэкі. Асобны раздзел прысвечаны захаванню памяці: інфармацыі пра вуліцы, помнікі, мемарыяльныя дошкі, мерапрыемствы ў гонар «Песняроў», якія праводзіліся ў музеях і бібліятэках, вобраз калектыву ў мастацтве, прысвечаныя яму фільмы і тэатральныя спектаклі. Усяго ў праекце сабрана больш за 600 дакументаў, і работа працягваецца.



Нацыянальны гістарычны музей прадставіў раннія здымкі «Песняроў» 1971—1973 гадоў, яны паказаны ў віртуальным праекце. Сярод дакументаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва — рэпертуарны пашпарт ансамбля з 1969 года, праграмы ранніх выступленняў 1971—1972 гадоў у Белдзяржфілармоніі, выпіска з пасяджэння Саюза кампазітараў, калі Уладзіміра Мулявіна прымалі ў саюз.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.
Фота nlb.by.

ИЗМЕНЕНИЕ И ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ

по жилому дому «Корабль» по г. п. 3.2 в составе объекта «Комплекс многоквартирных жилых домов со встроенными объектами общественного назначения и обслуживания в границах ул. Семашко – ул. Петровщина. Санкт-Петербургский квартал в г. Минске». 2-я очередь строительства. Жилые дома «Корабль» по г. п. №№ 3.1, 3.2, торгово-общественные помещения №№ 5.1, 5.2, 5.3 по г. п.», *опубликованной в газете «Звязда» от 30.10.2024 № 212 (30346)*

Застройщик: коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад» зарегистрировано Мингорисполкомом 05.01.2015 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 192400611.

Юридический и почтовый адрес: ул. С. Есенина, 4-107, г. Минск, 220025, Республика Беларусь, тел./факс +375 (17) 234-16-99, тел. +375 (17) 234-16-98.

Режим работы офиса продаж: понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15, обеденный перерыв с 13.00 до 13.45.

Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагаются **20** (двадцать) **квартир** без выполнения внутренних отделочных работ на **5-6 этажах** в жилом доме «Корабль» по г. п. № 3.2 **с учетом приобретения машино-места** в многоуровневом гараже-стоянке № 4.1. по г. п., в том числе:

- 4 (четыре) однокомнатные квартиры общей площадью 49,76 кв. м;
- 14 (четырнадцать) двухкомнатных квартир общей площадью от 57,33 до 69,4 кв. м;
- 2 (две) трехкомнатные квартиры общей площадью 88,85 кв. м.

Количество реализуемых машино-мест в гараже-стоянке по г. п. № 4.1 по настоящей проектной декларации для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, составляет **20** (двадцать) **машино-мест.**

Документы для заключения договоров создания объектов долевого строительства **будут приниматься** и регистрироваться в ходе личного приема и в порядке живой очереди **с 8.30 19.12.2024** (девятнадцатого декабря) года по адресу: **г. Минск, ул. С. Есенина, д. 6, офис 213 (офис продаж).**

Для подачи заявления и заключения договора необходимо наличие:

для физических лиц – паспорта (биометрического документа, удостоверяющего личность); доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке;

для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – документа, подтверждающего полномочия представителя, паспорта (биометрического документа, удостоверяющего личность) представителя, копии свидетельства о государственной регистрации и Устава.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и государственное предприятие «Управление капитального строительства Запад» оставляет за собой право заключить договор на заявленный объект долевого строительства с другим претендентом.

Срок действия настоящей проектной декларации – до момента опубликования новой проектной декларации.

Подробные сведения об объекте долевого строительства, о планировках квартир и ходе строительства можно получить в офисе продаж по адресу: **220025, г. Минск, ул. С. Есенина, д. 6, офис 213, тел.: +375 (17) 2341698, +375 (44) 7954444, +375 (44) 5593391.**

Квартиры	Площадь квартиры, кв. м	Стоимость 1 кв. м площади, бел. руб.	Стоимость машино-места, бел. руб.
1-комнатные	49,76	4 800,00	25 000,00
2-комнатные	57,33-59,57	4 800,00	
2-комнатные	63,63-69,4	4 600,00	
3-комнатные	88,85	4 400,00	

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона, оператор ЭТП:
ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н, iin.by, iintorgi.by

Продавец: ЗАО «Мальва-проспект», 223028, Минская обл., Минский р-н, с/с Ждановичский, аг. Ждановичи, ул. Линейная, д. 3, каб. 303

№	Наименование	Начальная цена, без НДС
1	**Капитальное строение (магазин «Цветы»),** расположенное по адресу: г. Минск, ул. Карла Либкнехта, 90, общ. пл. 192,5 кв. м	325 000,00 долл. США в эквиваленте по курсу НБ РБ на день проведения торгов

Аукцион состоится 27.12.2024, начало: 10.00, окончание: 16.00 на электронной торговой площадке iintorgi.by.
Время приема заявок: с 14.12.2024 09.00 до 26.12.2024 г. 16.00

Иные сведения о порядке проведения, в том числе об оформлении участия в торгах, определении лица, выигравшего торги, опубликованы на сайте ЭТП и в ранее опубликованном извещении о проведении публичных торгов в форме электронного аукциона в газете «Звязда» № 234 от 30.11.2024 (30368), стр. 6

Контактные тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by

ОБЪЯВЛЕНИЕ ОБ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГАХ

Государственным предприятием

«БелЮрОбеспечение» (192821149)

назначено проведение электронных торгов:

Организатор	Филиал № 5 «Гродненский КСМ» ОАО «Красносельскстройматериалы»
Предмет	Лот № 9.2025.01.00016 клуб-столовая площадью 2328,1 кв. м
Местонахождение	г. Гродно, ул. Санаторная, 5Б
Начальная стоимость	521 171,00 бел. руб. с НДС

Торги будут проведены 09.01.2025 с 9.00 до 18.00 на ЭТП e-auction.by.

Задаток в размере 10 процентов от стоимости лота должен быть зачислен после аккредитации (верификации) заявителя на ЭТП в срок до 16.00 08.01.2025. Подробная информация размещена на сайте e-auction.by в разделе «Аукционы».

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390
Продавец	ОАО «Белцветмет», Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, 42/2, район аг. Гатово. УНН 100088666
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1
Адрес ЭТП	www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов: бывшее в употреблении имущество.
Местоположение: Минский р-н, Новодворский с/с, аг. Гатово, 42/2

№ лота	Наименование	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.
1	**Автомобиль MAZ 6501A8-325-000, р/з АХ 0174-5,** 2013 г. в.	**52 164,00**
2	**Автомобиль MAZ 6501A8-325-000, р/з АО 5542-5,** 2013 г. в.	**41 688,00**
3	**Прицеп MAZ 856103-(010), р/з А 8286 В-5,** 2013 г. в.	**20 952,00**
4	**Прицеп MAZ 856103-(010), р/з А 8287 В-5,** 2013 г. в.	**20 952,00**

Цены снижены на 10 %.
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов
Условия оплаты предмета электронных торгов	**10 (десять)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 5 % от цены продажи лотов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 01.11.2024

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 26.12.2024.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 24.12.2024 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by

Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Лот:
- капитальное строение с инвентарным номером 120/С-17513 (наименование: Фирменный оптово-розничный магазин; назначение: здание специализированное розничной торговли) площадью 529,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Березовский р-н, г. Белоозерск, ул. Ленина, д. 5, на земельном участке с кадастровым номером 120851000002000170, площадью 0,0719 га, составные части и принадлежности: рампа;
- система пожарной сигнализации 36.785.388 (инвентарный номер по бух. учету 35), расположенная по адресу: Брестская обл., Березовский р-н, г. Белоозерск, ул. Ленина, д. 5;
- установка охранной сигнализации (инвентарный номер по бух. учету 49), расположенная по адресу: Брестская обл., Березовский р-н, г. Белоозерск, ул. Ленина, д. 5;
- теплосчетчик (инвентарный номер по бух. учету 10), расположенный по адресу: Брестская обл., Березовский р-н, г. Белоозерск, ул. Ленина, д. 5;
- система видеонаблюдения (инвентарный номер по бух. учету 5359), расположенная по адресу: Брестская обл., Березовский р-н, г. Белоозерск, ул. Ленина, д. 5

Начальная цена, руб. (с учетом НДС)	**197 094,61**	**Размер задатка, руб.**	**9 854,73**

Организатор электронных торгов, оператор электронной торговой площадки: Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701, gostorg.by.
Продавец: ОАО «Гомельдрев», 246042, г. Гомель, ул. Достоевского, 3, тел./факс 80232257324.
Задаток вносится на расчетный счет Организатора электронных торгов до подачи заявления. **Реквизиты для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901, назначение платежа: задаток за участие в электронных торгах по продаже объекта ОАО «Гомельдрев».
Условия продажи: без условий.
Срок заключения договора купли-продажи: в течение 10 рабочих дней со дня проведения электронных торгов.
Условия оплаты: в течение 30 календарных дней после заключения договора купли-продажи.
Информация о возмещении затрат: участник электронных торгов, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня электронных торгов возмещает вознаграждение Организатора торгов и фактические затраты на организацию и проведение электронных торгов.
Срок возможного отказа от проведения электронных торгов: не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения электронных торгов.
Шаг торгов: 5 %

Электронные торги состоятся 10 января 2025 г. в 11.00

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG».
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 08.01.2025 до 16.00

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2
Продавец	ОАО «Остромечево», 225034, Брестская обл., Брестский район, аг. Остромечево, пл. Октябрьская, д. 2
Оператор/ Адрес ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1; **www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов
Местонахождение: Брестский район, аг. Остромечево, пл. Октябрьская, д. 2 (лоты №№ 1, 4), Брестский район, д. Люта (лоты №№ 2, 3)

№ лота	Наименование	Инвентарный номер	Начальная цена лота с НДС 20 %, бел. руб.
1	**Грузовой бортовой GAZ -5312,** № кузова 531200H1093672, р/з АЕ 2450, 1987 г. в.	00009693	4 680,00
2	**Зерноуборочный комбайн МЕГА -218,** заводской № 94501851, р/з БУ 4595, 1998 г. в.	9922	54 000,00
3	**Жатка для зерновых культур CLASS C660,** 2008 г. в., с тележкой транспортной	00016553	16 200,00
4	**Грузовой фургон (FURGON) GAZ -3309,** № кузова 33090050893718, р/з АЕ 6371	00009056	7 440,00

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) календарных дней со дня завершения электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять) рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи. Расходы за снятие с учета/регистрации несутся покупателем

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

